*У вёсцы Шуневічы Глыбоцкага раёна ведалі: раз пачаўся вывад нашых войск з Афганістана, то Мікалай Грыцкевіч хутка будзе дома. Больш за ўсіх хвалявалася маці Галіна Піліпаўна. Бацька Іван Уладзіміравіч, адзін з лепшых механізатараў саўгаса імя Энгельса, таксама хваляваўся, але трымаў сябе ў руках і як мог супакойваў жонку. Другі сын Сяргей, які таксама выконваў інтэрнацыянальны абавязак у Афганістане, гаварыў бацькам: «Усё будзе добра, вернецца наш Мікалай».*

*І вось аднойчы ў светлы і сонечны майскі дзень першымі ўбачылі на ўскраіне вёскі высокага стройнага салдата з баявымі медалямі на грудзях усюдыісныя хлапчукі-першакласнікі. Шмат было цёплых сустрэч на роднай зямлі ў воіна-інтэрнацыяналіста. Але самая жаданая і доўгачаканая — сустрэча на парозе бацькоўскай хаты.*

**Фота М. АМЕЛЬЧАНКІ.**

